**Г. М. Саланкова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгоры

# Гістарычная гульня «Вандроўка па родным краі»

## Пазакласнае мерапрыемства з вучнямі 5 класа да Дня беларускага пісьменства і друку

**Мэты:**

✓засяродзіць увагу вучняў на гістарычным лёсе Беларусі, абудзіць у іх цікавасць да мінулага краіны і нацыянальнай спадчыны,

✓ фарміраваць паважлівыя адносіны да сваёй Айчыны, выхоўваць пачуццё любові да зямлі бацькоў, беларускага краю.

## Ход мерапрыемства

*На фоне музыкі «Мой родны кут» І. Лучанка вучань чытае верш С. Законнікава «Зямля мая...»*

Зямля мая,
ты для мяне - як дзіва,
Як першы дотык любае рукі,
Як у спякоту млосную ільдзінка,
Як на кашулі белай васількі.
Мне б толькі быць з табой - ну, хоць бы верасам,
Расінкай,
што пад промнямі дрыжыць.
Ты пражывеш і без мяне, я ведаю,
А мне ніколі без цябе не жыць.

**Настаўнік.** Добры дзень, паважаныя сябры! Я рада вітаць вас сёння ў гэтай зале! Запрашаю вас да размовы пра нашу Радзіму – цудоўную,

сінявокую Беларусь. Сёння мы з вамі здзейснім цікавае падарожжа па нашай цудоўнай краіне. На дошцы вы бачыце карту Рэспублікі. Кожная вобласць – гэта своеасаблівы прыпынак, на якім мы засяродзім увагу. З дапамогай прыпынкаў мы накіруемся ў падарожжа па нашай Беларусі, успомнім яе гісторыю, традыцыі і звычаі, песні . А для гледачоў нашых – гэта добры шанец папоўніць скарбонку ведаў. Запрашаю на сцэну ўдзельнікаў каманд.

**Прыпынак першы: «Гістарычны»**

Пытанні:

1. Дзе, калі і кім была надрукавана першая кніга на беларускай мове? Як яна называлася? *(6 жніўня 1517 г. у Празе Ф. Скарына выдаў першую кнігу на беларускай мове. Гэта быў пераклад кнігі Біблії «Псалтыр».)*

2. Што такое батлейка? *(Батлейка – лялечны тэатр, вядомы на Беларусі з XVI ст. Для паказу батлеечных спектакляў выкарыстоўвалася невялікая скрынка ў выглядзе хаткі ці царквы, падзеленая на ярусы.)*

3. Якую кветку М. Багдановіч лічыць сімвалам Бацькаўшчыны? *(Васілёк)*

4. Колькі гадоў нашаму гораду? (863)

5. Што дало падставы У. Караткевічу назваць нашу Беларусь «зямлёй пад белымі крыламі»? *(На Беларусі шмат буслоў.)*

**Прыпынак другі: «Лясны»**

Пытанні:

1.Якія дрэвы растуць у лясах Беларусі?

2. Якія жывёлы водзяцца ў лясах Беларусі?

3. Як правільна назваць маладую істоту, якая нарадзілася ў зубра, каровы, авечкі? *(Зубраня, ягня, цяля.)*

4. Перакладаем з рускай мовы словы: брусника, черника, клюква, малина. *(Брусніцы, чарніцы, журавіны, маліны.)*

**Гульня з гледачамі**

**Настаўнік.** Крок за крокам мы і дабраліся да возера загадак. Скажыце, калі ласка, ці ведаеце вы, якія расліны і якіх жывёл можна сустрэць у нашым родным краі? Вашы веды мы зараз праверым. Па чарзе я буду загадваць загадкі, хто ведае правільны адказ - падымаем рукі.Гатовы? Жадаю ўсім поспехаў.

Загадкі

**1.** Ён па лесе скок ды скок,
Косіць вокам з боку ў бок.
У дупле вавёрка – шчоўк,
А яму здаецца – воўк. *(Заяц)*

**2.** У ваду нырае смела,
Хатку ён будуе ўмела,
Пад вадой і на вадзе
Будаўніцтва ён вядзе.
*(Бабёр)*

**3.** Бы ў кошачкі галоўка,
А ў лапах сілу мае.
Па дрэвах лазіць
лоўка Драпежніца
лясная.
Ды хто яе не знае? *(Рысь)*

**4.** Ён прысмакаў з'еў нямала,
А калі харчоў не стала,
Лапу смокчучы, заснуў,
Ледзьве не праспаў вясну. *(Мядзведзь)*

**5.** Ён суровы і вялікі,

Вечна злосны, вечна дзікі,

Цяжка верыць, што з радні

**6.** З зерня хлеб духмяны будзе,

Раз укусіш – не забудзеш.

Яно, ну што там гаварыць,

Утварылася са слова «жыць». *(Жыта)*

**Прыпынак трэці: «Літаратурны»**

Пытанні:

1. Назавіце трох вядомых класікаў беларускай літаратуры. *(Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч).*

2. Назавіце беларускія народныя казкі.

3. Хто з паэтаў сказаў:

> «Мой родны кут, як ты мне мілы!
> Забыць цябе не маю сілы!
> Не раз, утомлены дарогай,
> Жыццём вясны мае убогай,
> К табе я ў думках залятаю І
> там душою спачываю».

*(Якуб Колас).*

4. Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе з'яву, прадмет, чалавека. *(Эпітэт.)*

5. Што такое псалом? *(Псалом - песня рэлігійнага зместу.)*

**Прыпынак чацвёрты : «Цікавыя загадкі»**

1. Хто гаворыць на ўсіх мовах? *(Язык)*

2. Які год цягнецца адзін дзень? *(Новы год)*

3. Сядзяць у крузе чатыры кошкі, супраць кожнай кошкі па тры. Колькі было разам? *(Чатыры)*

4. Стаяла хата, а ў хаце было сем акенцаў, а на кожным акенцы сядзела сем кошак, а ў кожнай кошкі было па сем кацянят. Увайшоў і я ў хату, і маіх

было дзве нагі. Колькі ўсіх было ног? *(Дзве нагі, бо ў катоў лапы.)*

**Гульня з гледачамі**

<u>Умова</u>: вам па чарзе будуць задавацца пытанні, але перш чым адказаць, неабходна добра падумаць, бо пытанні з сакрэтам. Гатовыя? Тады пачынаем.

<u>Віктарына</u>

1. Якія словы маюць сто зычных? *(Стог, стол, столь, стоп, стос.)*
2. Што знаходзіцца сярод ракі СОЖ? *(Літара О)*
3. З чаго пачынаецца і чым заканчваецца Нёман? *(Літарай Н)*
4. Што гэта такое: ёсць у азёрах і рэках, а ў акіянах няма; ёсць у дрэвах і травах, а ў кветках няма? *(Літара Р)*
5. Якую сельскагаспадарчую прыладу можна знайсці на галаве? *(Касу)*
6. Якую частку слова заўсёды знойдзеш у зямлі? *(Корань)*
7. Чым канчаюцца лета і зіма? *(Літарай А)*
8. Які часопіс у лесе знойдзеш? *(Бярозка)*
9. Што вы чуеце ў пачатку ўрока? *(У нескладовае)*

**Прыпынак пяты: «Востры на язык»**

<u>Пытанні:</u>

1. Пра каго гавораць, што ён вады не замуціць? *(Пра спакойнага, шчырага, рахманага чалавека.)*

2. Закончыць прыказку:

Хто дбае,... *(той і мае).*

Здароўе даражэй... *(за грошы).*

Хто за Радзіму гарой, ... *(той сапраўдны герой).*

Ранняя птушка зерне клюе, а... *(позняя вочкі трэ).*

Пра каго кажуць: «Хто дбае, той і мае»? *(Пра руплівага, працавітага чалавека.)*

**Прыпынак шосты: «Традыцыі і звычаі»**

Пытанні:

1. Якія святы адзначаюць на Беларусі?

2. Якія нацыянальныя стравы вы ведаеце?

. Якое народнае свята стала асновай псеўданіма пісьменніка? *(Купалле,* Янка Купала)

**Настаўнік.** Вось і закончылася наша гульня. Пакуль журы падводзіць вынікі, мы з вамі яшчэ зазірнем у музей кнігі, які знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Чаму менавіта ў гэты музей? Таму што гэты тыдзень прысвечаны Дню беларускай пісьменнасці, а свята ў гэтым годзе адбудзецца ў горадзе Полацку, што знаходзіцца ў Віцебскай вобласці. Увага на экран.

Спадзяюся, што вам мерапрыемства спадабалася, вы ўспомнілі, а можа, і даведаліся нешта новае пра нашу Беларусь. Я жадаю, каб усе былі шчаслівыя, любілі і аберагалі нашу краіну.

Да пабачэння! Дзякуй за ўдзел.

Я радасць сваю не стрымаю -<br>
І песня ўзлятае сама:<br>
Мне лепей ад роднага краю<br>
Нічога на свеце няма.

*Алесь Бачыла*